Такім чынам, аповесць «Сінія кветкі» – сінтэтычны твор, у якім арганічна звязаны элементы фантастыкі, інтэртэкстуальныя элементы, філасофія і псіхалагічныя матывы, дэкаратыўныя моманты. У аповесці ўдала пераплятаюцца звычайныя жыццёвыя, фантастычныя і рэальныя падзеі. З дапамогай містычнага вобраза сініх кветак аўтар прымушае героя адчуць усю бяссэнсавасць жыцця дзеля помсты. Такую сінтэтычную кайму твор набывае пры выкарыстанні паэтычнай парадыгмы і запазычання сітуацый зместу пратэксту. Так, сінія кветкі, як і ў творы Наваліса «Генрых фон Офтэрдзінген», застаюцца сімвалам надзеі, а герою аповесці даецца магчымасць пражыць яшчэ раз сваё жыццё. Як паказвае наша даследаванне, інтэртэкстуальныя элементы ў аповесці займаюць не галоўнае месца, а толькі выконваюць дапаможную ролю ў развіцці адметна новага сюжэта, тэматыкі і праблематыкі тэксту-рэцыпіента аповесці А. Федарэнкі «Сінія кветкі».

**Спіс крыніц**

1. *Миронова, Л. Н.* Учение о цвете / Л. Н. Миронова. – Мн. : Выш. школа, 1993. – 463 с.
2. *Новалис* Гейнрих фон Офтердинген; пер. Е. И. Никулиной / www. bookashop. ru.
3. *Федарэнка, А.* Сінія кветкі / А. Федарэнка // Смута: аповесці, апавяданні. – Мн. : Маст. літ., 1994. – С. 91–155.

***Д. Р. Туміла***
*Навуковы кіраўнік — В. М. Шавель*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ФАРМІРАВАННЕ АРФАГРАФІЧНАЙ ПІЛЬНАСЦІ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ СЛОЎНІКАВЫХ ДЫКТАНТАЎ РОЗНЫХ ВІДАЎ

З мэтай павышэння арфаграфічнай пільнасці вучняў неабходна выкарыстоўваць самыя разнастайныя формы і віды дыктантаў, улічваючы іх адпаведнасць асаблівасцям матэрыялу, які вывучаецца на ўроку, і этапам педагагічнага працэсу. Правядзенне слоўнікавых дыктантаў з’яўляецца адным з найбольш праверанных на практыцы відаў работы па выпрацоўцы арфаграфічнай пільнасці, эфектыўнасць якога павялічваецца за кошт аб’яднання работы над замацаваннем арфаграфічных уменняў і навыкаў вучняў з узбагачэннем іх лексічнага запасу.

Як асноўны сродак замацавання арфаграфічных уменняў і навыкаў Г. М. Прыступа разглядае слоўнікавыя дыктанты і вызначае наступныя асаблівасці арганізацыі правядзення слоўнікавых дыктантаў: праводзяцца толькі на аснове сістэматычнага паўтарэння; спалучаюць граматычнае ўсведамленне пісьма са зрокава-маторным і слыхава-рухальным запамінаннем; шматразова паўтараюцца (аўтаматызуюцца ўменні знаходзіць арфаграмы і забяспечваюцца ўстойлівыя арфаграфічныя навыкі і ўменні); павінны быць кампактнымі, невялікімі па аб’ёме і займаюць мала часу [2, с. 157].

Практыка паказвае, што слоўнікавыя дыктанты з’яўляюцца больш эфектыўнымі, калі яны арганічна звязаны з паслядоўным паўтарэннем фанетыкі і марфалогіі і праводзяцца сістэматычна.

З мэтай фарміравання арфаграфічнай пільнасці ў 5 класе на практыцы былі выкарыстаны наступныя віды слоўнікавых дыктантаў: слоўнікавыя дыктанты з «падказкай», слоўнікавыя дыктанты з самаправеркай, слоўнікавыя дыктанты з працягам, слоўнікавыя дыктанты з элементам гульні, слоўнікавыя дыктанты з ускладненнем дыдактычнага матэрыялу, выбарачны слоўнікавы дыктант, слоўнікавы дыктант з выкарыстаннем сігнальных картак.

Пры правядзенні слоўнікавага дыктанта з «падказкай» вучням прапаноўваецца частка ўмоў дзеяння арфаграфічнага правіла, аднак галоўную аперацыю вучні выконваюць самастойна: выбраць патрэбную арфаграму. Аб’ём падказкі залежыць ад узроўню падрыхтаванасці вучняў. Асноўная мэта правядзення прапанаванага вучням слоўнікавага дыктанта з самаправеркай – фарміраванне навыкаў самакантролю. Значна актывізуецца праца вучняў пры правядзенні слоўнікавага дыктанта з элементамі гульні. Гульня забяспечвае зацікаўленае ўспрыманне вучнямі матэрыялу, актывізуе дзейнасць, садзейнічае развіццю волі, памяці, мыслення. Было выяўлена, што гульня «Я працую чараўніком» не толькі абуджае цікавасць да работы, але і фарміруе ўменне выкарыстоўваць атрыманыя веды ў новых сітуацыях.

У працэсе выканання пісьмовых заданняў вучні сустракаюцца з цяжкасцямі пры напісанні некаторых слоў, якія не падпарадкоўваюцца законам арфаграфіі, а з’яўляюцца традыцыйнымі. У такіх выпадках вучань павінен звярнуцца да школьнага арфаграфічнага слоўніка. Надзвычай важна зацікавіць школьнікаў працай са слоўнікам, бо гэта садзейнічае развіццю здольнасці хутка аналізаваць слова, знаходзіць патрэбныя арфаграмы. З гэтай мэтай карысна выкарыстоўваць гульню «Даведачнае бюро», якая садзейнічае замацаванню навыкаў работы са слоўнікам. Як сведчаць вынікі эксперыменту, удумлівая праца са слоўнікам дапамагае вучням авалодаць нормамі правапісу, павышае арфаграфічную пільнасць.

Асаблівае месца на этапе засваення тэарэтычных ведаў і фарміравання арфаграфічных навыкаў займаюць выбарачныя слоўнікавыя дыктанты. Такі від дыктанта садзейнічае не толькі фарміраванню арфаграфічных навыкаў, але і дысцыплінуе ўвагу вучняў.

Азнаямленне з канкрэтным відам слоўнікавага дыктанта было пабудавана з улікам вывучаных тэм па раздзеле падручніка для 5 класа «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія» і складалася з наступных этапаў:

1) першапачатковае паўтарэнне адной-дзвюх тэм і на гэтай аснове замацаванне вывучанага матэрыялу. На гэтым этапе прапаноўваліся невялікія па памерах (10—15 слоў)слоўнікавыя дыктанты, якія займалі па часе 5 − 7 хвілін.

2) абагульняючае паўтарэнне і на гэтай аснове – кантрольныя слоўнікавыя дыктанты. На гэтым этапе па прычыне ўскладненасці матэрыялу і абмежаванасці ў часе рабіўся акцэнт на тэарэтычныя пытанні і выбарачную характарыстыку арфаграм.

Праведзены аналіз вучнёўскіх работ паказаў, што ў эксперыментальным класе, у якім праводзілася сістэматычная работа з выкарыстаннем слоўнікавых дыктантаў, арфаграфічная пісьменнасць значна павысілася. Атрыманыя вынікі эксперыментальнага навучання пацвердзілі эфектыўнасць сістэматычнага выкарыстання розных відаў дыктантаў.

Такім чынам, разнастайнасць відаў слоўнікавых дыктантаў садзейнічае не толькі фарміраванню ўменняў і навыкаў у галіне арфаграфіі, вучыць прыёмам граматыка-арфаграфічнага аналізу слоў, садзейнічае фарміраванню арфаграфічнай пільнасці, але і папярэджвае зніжэнне цікавасці да работы, уносіць ва ўрокі элементы навізны.

**Спіс крыніц**

1. *Красней, В. П.* Беларуская мова: вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання. У 2 ч. Ч. 2 / В. П. Красней [і інш. ]. – Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 2008. – 160 с.
2. *Приступа, Г. Н.* Основы методики орфографии в средней школе / Г. Н. Приступа. – Рязань, 1973. – 23с.

***Р. У. Федчук***
*Навуковы кіраўнік — В. М. Шавель*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ДА ПРАБЛЕМЫ РАБОТЫ НАД СТЫЛЕМ І ТЫПАМ ТЭКСТУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Зыходзячы з прынцыпу жанрава-стылістычнай арыентацыі пры развіцці мовы і маўлення, праграмы для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, патрабуюць, каб вучні 9-ых і 10-ых класаў умелі працаваць з тэкстамі розных стыляў і тыпаў маўлення. Адна з асноўных задач на дадзеным этапе — сістэматызаваць і паглыбіць атрыманыя ў папярэдніх класах веды па развіцці мовы і маўлення, выпрацоўваць адпаведныя практычныя ўменні і навыкі. Праграма арыентуе на тое, каб настаўнік удзяляў дастаткова ўвагі аналізу асаблівасцей тэкстаў навуковага, публіцыстычнага стылю, таму што на заключным этапе работы па развіцці звязнай мовы вучні павінны ўмець выступаць з дакладам, складзеным на аснове 2-3 крыніц.

Праведзеныя назіранні паказалі, што пры выбары тэкстаў для пераказаў настаўнікі звычайна выкарыстоўваюць рэкамендаваныя Міністэрствам адукацыі дапаможнікі. Намі былі прааналізаваны зборнікі пад агульнай рэдакцыяй П. А. Міхайлава (Мінск, 2006, 2004) з мэтай вызначэння стылю і тыпу прапанаваных для аналізу тэкстаў [1, 2].

Вучням 7-га і 10—11 класаў аўтарамі зборнікаў для работы прапануюцца тэксты пераважна мастацкага стылю (72% ад агульнай колькасці пераказаў), а тэксты публіцыстычнага стылю займаюць толькі 28% ад агульнай колькасці прапанаваных тэкстаў. Тэксты навуковага стылю для вучняў 7-га класа не прадугледжаны наогул, а для вучняў 10—11 класаў іх прапанавана 14% ад агульнай колькасці. Паводле тыпу маўлення як для вучняў 7-га, так і для вучняў 10—11 класаў прапануюцца тэксты-апавяданні, але колькасць тэкстаў-апісанняў павялічваецца ў 10—11 класах да чатырнаццаці. Тэматыка тэкстаў мастацкага стылю, прапанаваных для аналізу, даволі разнастайная: першая настаўніца («Дарога ў навуку» паводле Г. Далідовіча), Вялікая Айчынная вайна («Незагойная рана» паводле В. Быкава), вызваленне сялян ад прыгону («Паўстанцы» паводле В. Хомчанкі), прыгожае ў непрыгожым («Незвычайная жанчына» паводле У. Караткевіча) і інш. Тэксты публіцыстычнага стылю апісваюць жыццё, дзейнасць і подзвіг знакамітых людзей, напрыклад: «Наш Рыгор Раманавіч» паводле А. Бачылы, «Песня з «паўночных Афін» паводле Уладзіміра Караткевіча, «Адам Міцкевіч» паводле К. Цвіркі, «Ракуцёўшчына» паводле Г. Каханоўскага і інш. Тэксты навуковага стылю, прапанаваныя для аналізу, прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху вядомых беларускіх вучоных і пісьменнікаў, напрыклад: «Васіль Цяпінскі» паводле М. Батвінніка, «Пан Тадэвуш» паводле Л. Мірачынскага і інш. Настаўнік самастойна павінен адабраць на ўзор прапанаваных тэкстаў тэксты навуковага стылю ў неабходнай колькасці ў адпаведнасці з праграмнымі патрабаваннямі. Аднак настаўнікі сутыкаюцца з праблемай пошуку крыніц, з якіх можна выбраць тэксты адпаведнага стылю, таму замяняюць тэксты аднаго стылю іншым.